# У Нацыянальнай бібліятэцы прайшло мерапрыемства са смакам беларускай кухні

19.10.2023 10:51 | Аўтар: Лізавета Голад | Культура

Навіны | Папулярнае

11:34 У Цэнтры сучасных мастацтваў адкрыецца выстава па выніках «Нацыянальнай прэміі ў галіне выяўленчага мастацтва»

11:10 Вытворчы будынак прыватнага прадпрыемства гарэў у Лунінцы

10:48 Беларуская тэнісістка Аляксандра Сасновіч выйшла ў 1/4 фіналу турніру ў Кітаі

10:32 Старавойтава правядзе 24 кастрычніка асабісты прыём

УСЕ НАВІНЫ

Іншыя матэрыялы аўтара

Пачала працаваць экспазіцыя з паштовым адзяленнем

32-ю гадавіну незалежнасці Узбекістана адзначылі ў Мінску

У гонар 95-годдзя НАН Беларусі ў Мінску адкрылася архітэктурна-мастацкая кампазіцыя «Залатое кальцо беларускай навукі»

У педагогі — са школы

Цікавосткі беларускіх храмаў

**18 кастрычніка ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі прайшло мерапрыемства «Смак беларускай кухні ў кнігах і паштоўках: новыя праекты Алены Мікульчык». Яно было насычана яркімі эмоцыямі і цікавымі фактамі. Напрыклад, ці ведалі вы, што ў мачанцы крыецца беларуская нацыянальная ідэя або тое, што жульен першапачаткова быў халодным летнім супам?**




Аба ўсім гэтым госці мерапрыемства даведаліся падчас кулінарнага «Што? Дзе? Калі?». Акрамя таго, ў праграме былі дэгустацыя-абрад і, канешне, знаёмства з выданнямі аўтара.




Але ўсё ж такі галоўнымі героямі мерапрыемства сталі паштоўкі па матывах ужо выдадзеных кніг. Алена Мікульчык расказвае, што падчас праекта выпусцілі 32 паштоўкі з выявамі розных страў:

— Гэта гістарычная кухня XVII-XIX ст. у сучаснай апрацоўцы. Тое, што вы можаце самі прыгатаваць. На саміх паштовачках рацэптаў няма, але ёсць QR-код, па якім можна перайсці на сайт, дзе будуць рэцэпты і гісторыя страў. Набыць іх можна на галоўпаштамце і ў любым аддзяленні белпошты.




Таксама на мерапрымстве прысутнічала аўтар «смачных» фотаздымкаў Вольга Акуліч. Яна ўспомніла, з чаго калісьці пачалося яе супрацоўніцтва з Аленай Мікульчык:

— У сацыяльных сетках Алена вывесіла аб'яву. Яна шукала фатографа, каб тэрмінова паехаць у кулінарную экспедыцыю. Мне было цікава, што ж такое кулінарная экспедыцыя, я адгукнулася, і мы паехалі. Вынікам стала серыя рэпартажных фота. Пасля была серыя партрэтных здымкаў у падтрымку новай кнігі. Гэта было ажно 5 гадоў таму. І вось з партрэтнай серыі Алены пачалося наша супрацоўніцта. Яна прапанавала мне папрацаваць над яе новай кнігай пра шляхецкую кухню. За 4 гады ў нас выйшла дзве кнігі і вось цяпер серыя паштовак па матывах кніг.




Мерапрыемства завяршылася аўтограф-сесіяй.













**Лізавета ГОЛАД**

**Фота аўтара**